# Тэст «Свет загадак і цудаў»

***1. Міфы - гэта***

а)фантастычныя апавяданні,якія выдаюцца як верагодныя,хоць і не пацверджаны гістарычнымі фактамі;
б)народныя паданні пра паходжанне свету, жыццё прыроды і чалавека;
в)вусныя апавяданні,у якіх расказваецца пра незвычайныя з'явы, гістарычныя падзеі,народных герояў;
г)апавяданні пра жыццё і дзейнасць асобы, прызнанай царквой святой.

***2.Наймагутнейшы і галоўны з багоў, творца жыцця -***

а)Дажбог; в)Сварог;
б)Пярун; г)Ярыла.

***3. Пазнайце багоў па апісанні.***

***1.Пярун; 2.Ярыла; 3.Лада; 4.Цёця; 5.Зюзя; 6.Мара;***

а) Жанчана,якая можа прымаць самыя розныя аблiччы, станавіцца ваўком, змяёй, часам яна выглядала жудаснай істотай, з якой злупілі шкуру;
б)Магутны волат з сівымі, чорнымі або вогненна-рудымі кучаравымі валасамі і доўгай барадой. У руках трымае лук-вясёлку і стрэлы-маланкі, якія шпурляе на зямлю;
в)Маладзенькая дзяўчынка у белай сукенцы, упрыгожанай зялёнай лістотай, з вяночкам палявых красак;
г)Тоўсценькі нізенькі дзядок з белымі валасамі і белай як снег барадой, у белай вопратцы;
д)Мажная, прыгожая жанчына, прыбраная жытнёвымі каласамі, са спелымі пладамі ў руках;
е)Прыгожы малады вершнік на белым кані, у белай вопратцы, з чырвонай накідкай на плячах, у вянку з веснавых раслін, з зялёнымі галінкамі ў руцэ.

***4.За што адказваў бог***

***1.Жыва; 2.Вялес; 3.Жыжаль; 4.Купала?***

а)бог дабрабыту і мудрасці, апякун жывёлы, ахоўнік статка; в)бог ураджаю і дастатку;
б) апякун падземнага агню і кавальскага рамяства; г) багіня жыцця і долі;

***5.Што азначае выраз "вераб'іная ноч"?***

а) ціхая спакойная ноч; в) самая доўгая ноч у годзе;
б)ноч з бліскавіцамі і праліўным дажджом; г)самая кароткая ноч у годзе.

***6.Пазнайце міфічных істот (духаў) па апісанні***

***1.Палявік; 2.Лясун; 3.Дамавік; 4. Вадзянік; 5.Ваўкалак; 6. Баба Яга.***

а)Чалавек паратвораны кім-небудзь ці па ўласным жаданні ў ваўка;
б)Клапаціўся пра добры ўраджай на палях, зрабіўшыся страшным ценем пужаў людзей, заманьваў на сонцапёк і закалыхваў там да непрытомнасці;
в)Сівенькі дзядок у белай кашулі. Жыў пад печкай ці ў хляве, клапаціўся пра гаспадарку,даглядаў жывёлу, але мог і шкодзіць - біць посуд, казытаць ці шчыпаць ноччу соннага;
г)Вялізны барадаты стары у звярыных шкурах. Вушы надта вялікія, вочы свецяцца нават ноччу. Паказваў людзям грыбныя і ягадныя мясціны, але мог і застаўляць доўга блукаць на адным месцы;
д)Злая чараўніца, гаспадыня ўсіх ведзьмаў, страшная, чорная, раскудлачаная;
е)Усё цела яго пакрыта ці то валасамі,ці то водарасцямі,паміж пальцаў-перапонкі,рукі іногі вельмі доўгія. Раз'язджае на соме, рве рыбацкія сеткі,падпільноўвае тых, хто купаецца, каб зпцягнуць да сябе.

***7.Хто з беларускіх пісьменнікаў напісаў творы на аснове народных паданняў пра міфічных істот "Ваўкалак"і "Вужыная карона"?***

а)Якуб Колас; в)Ян Баршчэўскі;
б)Максім Багдановіч; г) Алег Мінкін;

***8.Хто з паэтаў прысвяціў свае вершы духам 1."Вадзянік" і 2."Агнявік"?***

а)Якуб Колас; в)Ян Баршчэўскі;
б)Максім Багдановіч; г) Алег Мінкін;

***9.Расстаўце па парадку часткі казкі Якуба Коласа "Жывая Вада"***

а)"Беднеў год ад году калісь багаты край"; в)Жывая Вада вырвалася на волю;
б)Гара праглынула Жывую Ваду; г)"Насталі сухія гады".

***10.Суаднясіце віды песень***

***1.Каляндарна-абрадавыя; 2.Сямейна-абрадавыя.***

а)вясельныя;
г)жніўныя;
б)вяснянкі; д)хрэсбінныя;
в)калядкі; е)купальскія.